здзічэнне часткі грамадства. Ён узарваўся чарнобыльскім атамам і крахам камуністычнай ідэалогіі. Напрыканцы жыцця М.Танку наканавана было ўбачыць неразумнасць існуючага свету і чалавечай дзейнасці, таму вобраз Часу напаўняецца ў яго творах трагедыйным зместам. Галубы-разведчыкі прыносяць лірычнаму герою верша «Мой каўчэг», які шукае мірнага прыстанішча, «*атручаныя промні Хірасімы, Нагасакі, Чарнобыля, / Пачарнелыя каласы збажыны / І гарачыя ад крыві гільзы патронаў*».

А.Куляшоў, выводзячы свайго героя, зямляніна, у касмічную прастору, верыў, што ён сцвердзіць «*у сусвеце / Зноў розум свой на міліярды год*». Вершы М.Танка «Экалогія», «Даўно развучыліся...», «Бразготка», «Мой каўчэг» палемічныя ў дачыненні да куляшоўскіх. Паэт гаворыць, што чалавек знявечыў, забрудзіў сваю планету, і ставіць пытанне: «*Як жа невукам гэтым / Ды ляцець на другія планеты?*».

Свет А.Куляшова гарманічны, хоць і небеспраблемны, чалавечны, хоць і неадназначны, складаны. У ім няма месца пачварным выявам сучаснай рэчаіснасці. Паэт верыў:

Пяройдзе шлях у новы шлях,
Растанне — ў новае спатканне,
Напеў жалейкі — ў труб гучанне,
Выток жыцця — ў жыцця працяг.

(«На паўмільярдным кіламетры»)

М.Танк, застаючыся аптымістам, жыў апошнія гады з вялікай трывогай у сэрцы за лёс Бацькаўшчыны і лёс усёй планеты, якой пагражае сённа бяздумная дзейнасць чалавека. Гэтай трывогай прасякнуты многія вершы канца 1980—90-х гадоў. Паэт філасофскага складу, ён вельмі рэдка звяртаўся да сродкаў публіцыстыкі, боль у яго творах не на паверхні, а ўнутры, нібы заціснуты аўтарскай рукой.

Уважна сочым,
Каб малыш,
Пачынаючы хадзіць,
Не спатыкнуўся,
Хоць гэта ў яго ўзросце,
Не узброенаму ні ведамі
Ні ўладаю,
Яшчэ нічым
Не пагражае свету.

(«Уважна сочым...»)

*Н. В. Заяц*

## ПАЭТЫЗАЦЫЯ ПЕРШААСНОЎ НАРОДНАГА ЖЫЦЦЯ Ў ТВОРАХ ВАСІЛЯ ЗУЁНКА І МАКСІМА ТАНКА

У кожнага — свая дарога. Ад маляўнічых берагоў рачулкі Начы ідзе па літаратурным гасцінцы Васіль Зуёнак. Ад нарачанскіх затокаў і тоняў бярэ пачатак паэтычны шлях Максіма Танка. У кожнага з іх — свая дарога ў Паэзію, але і для Зуёнка, і для Танка стала яна «*дарогай ад плуга да пяра*». І менавіта ў непарыўнай еднасці з плугам, сялянскай працай заключана духоўная моц абодвух паэтаў, аснова іх сапраўды народнага таленту.



«Народная светаўява і духаўгрунтаванне — асноватворная сутнасць паэзіі Максіма Танка. Ён вырас як чалавек, асоба, і вырасла яго слова на гэтай глебе»,— пісаў Зуёнак пра свайго старэйшага калегу. Народная глеба ўзгадавала як чалавека і як асобу і самога В. Зуёнка.

Я знаю бога!
Я — малюся
Ўсясільнай працы, хлебу на стале,
Рукам мазолістым —
Малюся!

(В.Зуёнак. «Пачатак»)

Паэтызацыя, нават абагаўленне першаасноў жыцця простага селяніна — працы, бохана хлеба, рук і г.д.— адзнака творчасці абодвух мастакоў слова. Праца — гэта і зуёнкаўскі сялянскі бог, які дарує жыццё; і адзіная мера ўсяго створанага на зямлі, як у Максіма Танка: «*Усе вартасці, ісціны меру / Я мужыцкім аршынам — працай*» («Бібліятэка»). Галоўнай мерай усіх вартасцей і ісцін, самай большай пахвалой, на думку Танка, служаць вельмі простыя, але такія значныя для чалавека працы словы: «*Ён зарабіў на хлеб*». Радасць і гонар ахопліваюць маленькага пастушка, лірычнага героя зуёнкаўскага верша «Пачатак», калі ўпершыню ён чуе ад маці наказ: «*Шануйся,— працаўнік цяпер ты ў хаце...*» Пачаткам жыццёвага шляху, знакам сапраўднага сталення становіцца першы дзень самастойнай працы, зароблены сваімі рукамі кавалак хлеба.

Спрацаваныя рукі селяніна з'яўляюцца для абодвух паэтаў сапраўднай святыняй, «*двухадзіным богам рук мазольных*», па словах Зуёнка. Узвышана, пяшчотна, прачула, як пра вышэйшую каштоўнасць у свеце, змог сказаць Максім Танк пра агрубелыя, у чорных, глыбокіх шрамах і маршчынах матуліны рукі: «*Іх цалавала зямля / Сваімі пясчанымі вуснамі / І каласамі; / Неба спякотай, вятрамі, дажджамі / Іх цалавала*» («Рукі маці»). Цалаваныя зямлёю, каласамі, сонцам, «*пасіверакья, парэпаныя*» рукі жанчыны-працаўніцы нічым не адмыць нават «*перад апошняю дарогай*». Але такія рукі — не загана, якой трэба саромецца. Мазалі, лічыць Зуёнак, гэта «*працы вузлы, багацце / Найчаснейшае на зямлі*» («Аб мазалях»).

Дзякуючы гэтым агрубелым і мазолістым рукам, на стол кладзецца духмяны бохан хлеба — «*сонцу раўня*».

Пракіслы, ёлісты, гаркавы —
За ўсё на свеце саладзей
Здаваўся шчасця светлы кавал...
Я веру ў хлеб, як у людзей.

(В.Зуёнак. «На сэрцы — неспакою камень»)

Вера ў бохан жытняга хлеба, у якім скандэнсавана ўся жыццядайная сіла зямлі («*Жыццё і жыта — як адно*») цесна злучана з верай у стваральную моц чалавека, у яго лепшыя якасці: працалюбства, сумленнасць, маральнасць. З'яўляючыся адным з любімых вобразаў, хлеб, паводле слоў М. Гіля, «у Зуёнка не проста ўпадабаны аднаго разу паэтычны вобраз, а неперахадны бессмяротны сімвал бясконцасці і вечнасці народнага жыцця». Жыццё селяніна ўяўляецца як няспынны кругазварот: сяўба змяняецца жнівом, жніво — сяўбою. І гэта змена паўтараецца з году ў год, з веку ў век: «*Збіраю зерне — дбаю аб сяўбе, / А сею — з думкаю аб новым хлебе*» (В.Зуёнак «Ты пайшоў»).

Адвечны клопат *«аб новым хлебе»* — аснова руху жыцця, не толькі фізічнага існавання чалавека, але і духоўнай пераемнасці паміж пакаленнямі. Паэт перакананы, што толькі са смакам акрайца жытняга хлеба, з яго духмяным водарам прыйдзе адчуванне знітаванасці мінулага з будучым. Захаваць гэтую знітаванасць – вялікае жаданне В.Зуёнка: *«Мой дзень, малю цябе прад небам: / На тым, апошнім рубяжы / Спрадвечны цуд зямнога хлеба / Наступнікам перакажы!»* («На сэрцы – неспакою камень...»).

Сімвалічную напоўненасць мае вобраз хлеба і ў паэзіі Максіма Танка («Тры паклоны», «Прытча пра хлеб», «Ён зарабіў на хлеб»). Так, у вершы «Мой хлеб надзённы» гэты вобраз атаясамліваецца з паэтавым лёсам, які неаддзельны ад лёсу Радзімы. І хоць цяжкасцей на жыццёвых шляхах было больш, чым радасці, усё ж другога хлеба не трэба ні лірычнаму герою верша, ні Танку. З вобразам хлеба звязваецца ў Максіма Танка клопат аб роднай зямлі: *«Непакой за цябе, зямля мая,– / Мой хлеб надзённы»*.

Пашана да зямлі, што спрадвеку была карміцелькай,— аснова народнага светапогляду. *«Зямля — мая аснова»*,— заяўляе В.Зуёнак у адным з вершаў свайго першага зборніка «Крэсіва», рэцэнзуючы які У.Караткевіч вылучыў адну з галоўных якасцей паэтавай творчасці — «трывалую і дыхтоўную, моцную народную стыхію». Гэтая стыхія не адпускае Зуёнка і праз гады, ды і сам паэт не хоча парываць з ёй сувязі. Як араты за плугам, ідзе ён па літаратурнай ніве: *«Я трыццаць год на асфальце, / А ўсё яшчэ цяжка хаджу — / Сутулены, / Нібы за плугам, / Над баразною — / Плечы да сонца»* («Я трыццаць год на асфальце...»).

Толькі на ліст, напісаны плугам, атрымаў адказ лірычны герой верша Максіма Танка «Перапіска з зямлёй»: зямля прызнала першаснасць сялянскай працы, перавагу яе над іншымі відамі чалавечай дзейнасці. Па словах М.Арочкі, «уся грамадзянская лірыка паэта з'яўляецца своеасаблівай, поўнай улюбёнасці і трывог «перапіскай з зямлёй». Думаецца, не будзе памылкай сказаць гэта і пра творчасць В. Зуёнка. Генетычная сувязь паэтаў з роднай зямлёй такая ж трывалая, як у іх продкаў — сейбітаў і аратых.

Чалавеку яшчэ з часоў міфічнага Ікара ўласціва імкненне да нязведанага, жаданне ўзняцца да зор і сонца. Але важна, узняўшыся ў неба, не страціць зямлю, дзе красуе жыта, дзе ты атрымаў жыццё. Прыцягненне да зямлі Максімам Танкам разумеецца не проста як фізічны закон, а становіцца законам духоўным («Зямное прыцягненне»). Сцвердзіць гэты закон, захаваць «духоўнае прыцягненне» імкнецца і В.Зуёнак: *«Зямля мая, / Не дай нам адарвацца, / Ляці за намі / Ў тысячу пагонь»*, бо *«крылы мы ствараем, / Каб вяртацца»* («Прыцягненне»). Зноў і зноў вяртацца да першаасноў і адчуваць духмяны водар жытняга хлеба, умець бачыць прыгажосць у патрэсканых руках селяніна, захапляцца яго працай — гэтага хоча «вечны араты» В.Зуёнак для сябе і для іншых.

«З усіх сцяжын,— пісаў Васіль Зуёнак у аўтабіяграфіі,— бачу тую дарогу, якой трымаюцца вяскоўцы мае: сеяць, жаць, малаціць і — зноў сеяць». З усіх жыццёвых сцяжын бачылася вечная, бясконцая, «закалыханая жытам» дарога Максіму Танку. На шчасце, шлях *«ад плуга да пяра»* гэтых — вельмі розных, але блізкіх у сваёй замілаванасці першаасновамі народнага жыцця — паэтаў не стаў дарогай у бяспамяцтва і забыццё.